# КАМУНІКАТЫЎНАЯ КАМПЕТЭНТНАСЦЬ ЯК АСОБАСНА-ПРАФЕСІЯНАЛЬНАЯ ЯКАСЦЬ НАСТАЎНІКА

***Л. М. ЦІМАШКОВА,***

***в. а. дацэнта кафедры педагогікі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, кандыдат педагагічных навук***

Цяпер увага звернута на развіццё ідэі гуманістычнай адукацыі, што дае падставы для наступных напрамкаў яе гуманізацыі: стварэння культуры развіцця выхаванцаў; забеспячэння іх гуманітарнай пісьменнасцю; умацавання духоўнасці (аксіялагічнага ядра асобы, пачуцця ўласнай годнасці як выяўлення прадуктыўнай арыентацыі асобы, прынцыпаў маральных паводзін).

Перабудова школы на гуманітарных пачатках патрабуе ад педагога ажыццяўлення асобаснага падыходу, уліку індывідуальных асаблівасцей кожнага вучня, усталявання дэмакратычнага стылю зносін з ім. У сувязі з гэтым актуалізуецца такое паняцце, як «педагагічныя зносіны», што ўсё больш усталёўваюцца ў якасці аднаго з асноўных кампанентаў прафесіянальнай дзейнасці настаўніка.

Разам з тым у рэальнай практыцы вышэйшай педагагічнай адукацыі мае месца дамінаванне утылітарнага і тэхнакратычнага падыходаў, сутнасць якіх заключаецца ў арыентацыі будучага настаўніка на вучня як на аб'ект усемагчымых уздзеянняў і маніпуляцый. Навучальна-выхаваўчы працэс часам будуецца на маналогах педагога, а па іх узору і на маналогах школьнікаў. У многіх выпадках пераважае аўтарытарна-імператыўны стыль зносін, навучанне носіць абязлічаны, прадметна-накіраваны характар. Гэта прыводзіць да ўзнікнення супярэчнасці паміж фундаментальнымі гуманістычнымі ідэямі і нізкім узроўнем іх рэалізацыі, што нярэдка звязана з унутранай непадрыхтаванасцю педагога да ажыццяўлення гуманістычнага, асобасна-арыентаванага падыходу ў выхаванні і навучанні.

**Таму галоўная задача сучаснай вышэйшай педагагічнай адукацыі заключаецца ў аказанні дапамогі будучаму настаўніку ў развіцці ў яго самаразумення, самаўспрымання, самаўдасканалення, прафесіянальнай самасвядомасці ў арыентацыі на самакаштоўнасць дзяцінства, на ўсведамленне унікальнасці і непаўторнасці кожнага чалавека, каштоўнасці зносін і суб'ект-суб'ектыўных адносін у сістэме міжасобаснага ўзаемадзеяння.**

Працэс уздзеяння на вучня не вычэрпваецца свядома арганізаванымі выхаваўчымі сітуацыямі. Ён ажыццяўляецца бесперапынна. Асабістыя якасці настаўніка як індывіда, як прадстаўніка пэўнага асяроддзя ўплываюць на вучня не толькі ў рамках канкрэтнай сітуацыі, але і за яе межамі. У сувязі з гэтым камунікатыўная кампетэнтнасць выступае як адна з найбольш важных прафесіянальна значных характарыстык педагога, а развіццё гэтай кампетэнцыі – як адна з галоўных задач вышэйшай прафесіянальна-педагагічнай адукацыі.

Аднак шляхі і метады фарміравання гэтай інтэгратыўнай якасці настаўніка як прафесіянальнай, цэласнай уласцівасці ў сучасных даследаваннях прадстаўлены недастаткова. Такую сітуацыю можна вытлумачыць тым, што ў сістэме вышэйшай адукацыі спецыяльна не ставілася задача развіцця камунікатыўнай кампетэнтнасці будучага настаўніка ці вырашалася часткова, у асобных аспектах.

**Ні адна з функцый педагога не можа быць ажыццёўлена па-за шматбаковага ўзаемадзеяння і зносін з людзьмі, перш за ўсё з вучнямі. І таму ў педагагічнай дзейнасці зносіны не проста адна з функцый настаўніка побач з іншымі, яна выступае як універсальная форма самой дзейнасці, як тое, у чым уласна і жыве, функцыяніруе дадзеная дзейнасць. Зносіны і супрацоўніцтва складаюць жывую тканіну дзейнасці педагога, у прыватнасці, працэс навучання мае ярка выяўленую камунікатыўную прыроду.**

Значэнне зносін у жыцці дзіцяці цяжка пераацаніць. Патрэбнасць у іх з'яўляецца фундаментальнай патрэбнасцю чалавека: без зносін немагчыма паўнацэннае развіццё асобы. У школьным узросце імкненне далучыцца да унутранага свету іншага, убачыць яго вачамі іншых і быць пачутым, зразумелым набывае асаблівую значнасць. Школа прыцягвае вучняў не столькі новымі ведамі, колькі магчымасцю задаволіць актуальныя для сябе патрэбнасці ў зносінах, самасцвярджэнні, творчасці, адкрыцці лепшага ў сваім «Я». Пытанні зносін, узаемнага ўплыву людзей адзін на аднаго, адносіны паміж імі займаюць цэнтральнае месца як у філасофскай і псіхолага-педагагічнай літаратуры далёкіх часоў, так і ў сучасных даследаваннях.

Педагагічныя зносіны – гэта прадуктыўныя зносіны. Іх прадуктам з'яўляецца духоўнае ўзбагачэнне двух бакоў: педагога і вучня. Але такое ўзбагачэнне магчыма, калі педагагічныя зносіны пабудаваны на аснове эмацыянальна-каштоўнасных адносін да дзіцяці. Не выпадкова, асаблівую актуальнасць сёння набываюць гуманістычныя канцэпцыі выхавання і навучання (педагогіка ненасілля, педагогіка супрацоўніцтва, канцэпцыя асобасна-арыентаванага выхавання і навучання), якія на першы план вылучаюць духоўна-маральнае ўзаемадзеянне педагога і школьнікаў, працэс абмену гуманістычнымі каштоўнасцямі. Дзіця з «аб'екта ўздзеяння» ператвараецца ў паўнацэннага партнёра па сумеснай дзейнасці, асобу, якая не павінна падвяргацца якім-небудзь маніпуляцыям. Усё гэта можа быць рэалізавана толькі ў працэсе інтэнсіўных і паўнацэнных зносін.

Ідэя гуманізацыі зносін мае два бакі: метадалагічны, які навукова абгрунтоўвае яе, і практычны, што дазваляе рэалізаваць гуманістычныя зносіны ў непасрэднай педагагічнай дзейнасці.

Метадалагічны бок ідэі гуманізацыі зносін настаўніка і вучняў абапіраецца на асноўныя палажэнні гуманістычнай канцэпцыі чалавека, аб чым гаварылася вышэй. Практычная рэалізацыя ідэі гуманістычных зносін мае на мэце выкананне пэўных умоў. Перш за ўсё добра, калі настаўнік умее «трансліраваць» добразычлівасць. Гэты прыём уяўляе комплекс вербальных і невербальных спосабаў паведамлення партнёру, што ён успрыма-

ецца як паважаны чалавек, які выклікае сімпатыю. Дзеці павінны быць упэўнены ў добразычлівасці, чуласці педагога: ацэнкі, крытычныя заўвагі і пажаданні настаўніка заўсёды ўспрымаюцца і інтэрпрэтуюцца вучнямі менавіта ў кантэксце яго адносін да іх. Нават у канфліктных сітуацыях асновай паводзін педагога з гуманістычнай накіраванасцю будзе вытрымка, уменне стрымліваць эмоцыі, прадбачанне магчымых вынікаў сваіх слоў і ўчынкаў, г. зн. трансляцыя добразычлівасці.

Слова настаўніка выконвае не толькі адукацыйную і выхаваўчую функцыю, але і валеалагічную. Педагог павінен навучыцца валодаць гэтым інструментам, не наносячы шкоды дзіцячай псіхіцы. Менавіта таму асаблівае значэнне набывае захаванне настаўнікам педагагічнага этыкету і такту.

Зносіны могуць быць пабудаваны ў гарызантальнай плоскасці (педагог і вучань на адной прамой, на роўных) і ў вертыкальнай (педагог вышэй за вучня, над ім). Гарызантальныя зносіны педагагічна плённыя, гуманныя па сваёй сутнасці, вертыкальныя часта правакуюць школьніка на супраціўленне. Гарызантальныя разглядаюць, звычайна, як суб'ет-суб'ектыўныя зносіны, дыялагічнае ўздзеянне.

Зносіны ў сістэме «настаўнік – вучань» нясуць у сабе больш глыбокую функцыю, чым проста кантакты паміж людзьмі. Яны развіваюць веру ў сябе, фарміруюць пазітыўны вобраз «Я», стымулююць актыўнасць вучня ў навучальна-выхаваўчым працэсе. У прафесіі педагога зносіны з фактару, што суправаджае дзейнасць, ператвараюцца ў істотны атрыбут педагагічнай дзейнасці. Значыць, прафесіянальная кампетэнтнасць для настаўніка – гэта перш за ўсё камунікатыўная кампетэнтнасць.

Тлумачальны слоўнік рускай мовы С. І. Ожагава вызначае кампетэнтнасць чалавека як «валоданне дастатковымі ведамі, дасведчанасць у якой-небудзь галіне» [1]. Значыць, кампетэнтнасць можа быць вызначана як сукупнасць ведаў, уменняў і навыкаў чалавека ў якой-небудзь дзейнасці. Зыходзячы з гэтага, камунікатыўная кампетэнтнасць можа быць вызначана як сукупнасць камунікатыўных ведаў, уменняў і навыкаў, што дазваляюць чалавеку мець эфектыўныя зносіны.

Камунікатыўную кампетэнтнасць мы разглядаем як складанае цэласна-асобаснае ўтварэнне, якое ўключае гуманістычныя арыентацыі, камунікатыўныя каштоўнасці, сукупнасць асобасных якасцей, што забяспечваюць гатоўнасць да дыялагічных зносін, веды асноў зносін і культуры ўзаемадзеяння, якія выяўляюцца ў працэсе педагагічных зносін.

Сістэмны аналіз камунікатыўнай кампетэнтнасці педагога як інтэгратыўнай якасці асобы дае падставы вылучыць наступныя яе кампаненты: **каштоўнасна-асобасны, кагнітыўны, аперацыйна-дзейнасны.**

**Каштоўнасна-асобасны кампанент** уключае гуманістычныя арыентацыі, камунікатыўныя каштоўнасці настаўніка, сукупнасць каштоўнасных якасцей, якія забяспечваюць гатоўнасць да дыялагічных зносін.

**Кагнітыўны кампанент** аб'ядноўвае веды аб заканамернасцях зносін, камунікатыўных уласцівасцей асобы, вопыт аперыравання гэтымі ведамі, вопыт фармулявання педагагічных задач і мадэліравання камунікатыўных паводзін.

**Аперацыйна-дзейнасны кампанент** уключае ўменні і навыкі зносін, што абумоўліваюць культуру ўзаемадзеяння.

Структурныя кампаненты камунікатыўнай кампетэнтнасці ўзаемазвязаныя і ўзаемазалежныя. Вызначальнае месца займаюць гуманістычныя арыентацыі і камунікатыўныя каштоўнасці, якія вызначаюць наяўнасць тых ці іншых матываў паводзін, аказваюць значны ўплыў на дзеянні педагога ў непасрэдных зносінах з дзецьмі, стымулююць узнікненне патрэбнасці ў будучага педагога ў набыцці прафесіянальна значных, камунікатыўных ведаў. Каштоўнасныя арыентацыі, асобасны сэнс прафесіі маюць прынцыповае значэнне для фарміравання індывідуальнага стылю педагагічнай дзейнасці, што вызначае яго гуманны, дэмакратычны ці аўтарытарны характар.

Развіццё камунікатыўнай кампетэнтнасці адбываецца пры пастаянным асэнсаванні, аналізе ўласнай педагагічнай дзейнасці, учынкаў, паводзін. Усведамленне, крытычны аналіз і вызначэнне шляхоў канструктыўнага ўдасканалення сваёй дзейнасці ажыццяўляецца з дапамогай **камунікатыўнай рэфлексіі.** Менавіта гэта якасць была вылучана намі як адна з вядучых якасцей асобы педагога. Камунікатыўная рэфлексія вызначае адносіны настаўніка да самога сябе як да суб'екта прафесіянальнай дзейнасці, прадбачання сябе ў педагагічнай сітуацыі.

Настаўнік стаіць перад неабходнасцю хуткай адаптацыі да асаблівасцей розных вучнёўскіх груп, патрэбнасцю вар'іраваць сродкі, формы, прыёмы камунікацыі ў залежнасці ад узроставых асаблівасцей школьнікаў, іх індывідуальных характарыстык і ўзроўню адукаванасці. Таму павышэнне ўзроўню камунікатыўнай кампетэнтнасці залежыць не ад засваення ім нейкіх нарматыўных узораў, а ад пашырэння магчымага спектра паводзін. Гэта становіцца рэальным пры дастаткова развітой якасці – **гібкасці ў зносінах.** Паколькі настаўнік з'яўляецца ініцыятарам вырашэння педагагічных задач, яму трэба ўмець разглядаць розныя варыянты ўзаемадзеяння з канкрэтным вучнем ці групай школьнікаў.

Гібкасць у зносінах немагчыма праявіць, калі ў педагога адсутнічае такая важная якасць, як эмпатыя, якую часта трактуюць як спасціжэнне эмацыянальнага стану, пранікненне ў перажыванні іншага чалавека. У якасці асобных форм эмпатыі вылучаюць суперажыванне-перажыванне суб'ектам таго ж эмацыянальнага стану, які адчувае іншы чалавек праз атаясамленне з ім, і спачуванне-перажыванне ўласнага эмацыянальнага стану з выпадку адчування іншага.

Спецыфічнай асобаснай якасцю ў структуры камунікатыўнай кампетэнтнасці з'яўляецца **педагагічная камунікабельнасць.** Камунікабельнасць як здольнасць лёгка ўваходзіць у зносіны, устанаўліваць і падтрымліваць кантакты развіваецца на аснове патрэбнасці ў зносінах – адной з асноўных сацыягенных патрэбнасцей чалавека. Да вядучых прыкмет педагагічнай камунікабельнасці І. І. Рыданава адносіць наступныя: патрэбнасць у зносінах з дзецьмі; станоўчая эмацыянальная танальнасць; дамінуючыя перажыванні пачуцця задавальнення зносінамі; узаемная асобасная атракцыя (настаўніка і вучня); разуменне дзяцей, здольнасць устанаўліваць індывідуальныя і групавыя кантакты; канструктыўнае вырашэнне міжасобасных супярэчнасцей; гуманізм і дэмакратызм зносін; эстэтыка зносін [2].

Настаўнікаў з высокім узроўнем патрэбнасці ў зносінах вылучаюць імкненне да падтрымання кантактаў з вучнямі, схільнасць праяўляць удзел у дзіцячых праблемах. Педагог нібы імкнецца зменшыць дыстанцыю паміж сабой і выхаванцамі, яго таварыскасць накіравана ў рэчышча вырашэння педагагічных задач, пры гэтым зносіны выступаюць як мэта дзейнасці.

Сукупнасць такіх якасцей, як камунікатыўная рэфлексія, гібкасць у зносінах, эмпатыя, педагагічная камунікабельнасць, абумоўлівае выяўленасць у педагога **ўмення арганізоўваць зносіны супрацоўніцтва.** Дадзеная асобасная якасць узнікае на аснове цікавасці да партнёра, да дзейнасці, на аснове жадання працаваць разам, прымаць удзел у агульнай справе.

Уменне арганізоўваць зносіны супрацоўніцтва ўключае ў сябе камбінуючыя здольнасці і ўменні: фармуляваць свой пункт гледжання, слухаць і чуць іншага, выяўляць пункты гледжання сваіх партнёраў; вырашаць рознагалоссі з дапамогай лагічнай аргументацыі, не пераводзіць лагічныя супярэчнасці ў плоскасць уласных зносін, заахвочваць актыўнасць іншага і своечасова праяўляць сваю ініцыятыву; аказваць іншаму эмацыянальную і змястоўную падтрымку, а першапачаткова – убачыць, хто ў гэтым асабліва мае патрэбу.

Асаблівае значэнне ў развіцці камунікатыўнай кампетэнтнасці мае **эмацыянальная прывабнасць.** Педагог, як і ўсе людзі, прадстаўляе сябе іншым праз вербальныя і невербальныя сродкі зносін. Увага навакольных звяртаецца не толькі на тое, што гаворыць настаўнік, але і на знешняе выяўленне яго пачуцця ў пантаміміцы. Прыемныя манеры паводзін (міміка,

жэсты, поза) схіляюць вучняў, спрошчваюць устанаўленне камунікатыўных сувязей, дапамагаюць арганізаваць эфектыўнае ўзаемадзеянне. Адзін настаўнік, уступаючы ў кантакт з вучнямі, сваёй манерай паводзін, пачуццёвасцю падтрымлівае ці стварае ўмовы для сумеснай дзейнасці, а другі – уносіць ва ўзаемаадносіны з дзецьмі напружанасць, правакуе развіццё ў іх адмоўных эмоцый.

Сярод неабходных уменняў, ад якіх залежыць эфектыўнасць зносін, асобнае месца займае **ўменне аказваць псіхалагічнае ўздзеянне** на вучня, адэкватнае вырашаемай педагагічнай задачы. Улічваючы, што арсенал сродкаў псіхалагічнага ўздзеяння ў зносінах вельмі шырокі і шматгранны, гэты абагульняючы паказчык з'яўляецца састаўным і шматпазіцыйным. Вылучаюцца тры састаўныя псіхалагічнага ўздзеяння: вербальнае (моўнае), паралінгвістычнае (характарыстыкі голасу) і невербальнае.

У працы настаўніка часта ўзнікае часовы псіхалагічны стан як рэакцыя на асаблівую педагагічную сітуацыю. Паступова ён можа ператварацца ва ўстойлівы эмацыянальны стан і ў гэтым плане стаць рэзервам развіцця асобы. Функцыянальны стан можа быць камфортным, для якога характэрны аптымальныя суадносіны напружання і працаздольнасці, і дыскамфортным, што выяўляецца ў зніжэнні працаздольнасці, павышэнні стамляльнасці, трывожнасці, памылках. У дадзенай сітуацыі асаблівае значэнне набывае такая асобасная якасць настаўніка, як **эмацыянальная ўстойлівасць.**

Здольнасць супрацьстаяць цяжкасцям фарміруецца ў працэсе жыццядзейнасці. Яна цесна звязана з адлюстраваннем уласных магчымасцей чалавека, з вопытам вырашэння аналагічных сітуацый, з выбарам спосабу пераадолення перашкод у складанай сітуацыі. Эмацыянальная ўстойлівасць дапамагае педагогу кантраляваць уласныя эмацыянальныя рэакцыі і лепш адлюстроўваць дынаміку міжасобасных зносін.

На прапануемы пералік камунікатыўна-значных якасцей можна глядзець з розных пазіцый: як на частку педагагічнага патэнцыялу; як на пералік прафесіянальных патрабаванняў да педагога; як на якасці, што ўказваюць на схільнасць да педагагічнай прафесіі; як на характарыстыку педагагічнай культуры настаўніка.

Асаблівасць пералічаных якасцей заключаецца ў тым, што кожная з іх з'яўляецца інтэгратыўнай (аб'ядноўвае ў сабе мноства больш вузкіх і канкрэтных паказчыкаў, праз якія праяўляецца), комплекснай (ахоплівае розныя працэсы, сферы дзейнасці) і характарызуецца шматузроўневай структурай (убірае ў сябе веды аб дадзенай якасці і спосабах яе праяўлення, уменне дэманстраваць яе). Усе гэтыя якасці знаходзяцца ў цеснай узаемасувязі паміж сабой, спалучаюцца адна з адной і ўтвараюць пэўную цэласнасць і адзінства.

Разуменне камунікатыўнай кампетэнтнасці як цэласнага ўтварэння дало магчымасць вызначыць структуру камунікатыўнай кампетэнтнасці.

**Схема камунікатыўнай кампетэнтнасці настаўніка**

Гуманістычныя арыентацыі, камунікатыўныя каштоўнасці, сукупнасць асобасных якасцей

Веды аб заканамернасцях зносін, вопыт аперыравання імі

Уменні і навыкі зносін, якія абумоўліваюць культуру ўзаемадзеяння

Гэтыя камунікатыўна значныя якасці суадносяцца з эфектыўным гуманістычным метадам кіравання вучнем – «фасілітацыяй» – стымуляцый актыўнасці і вызваленнем ад трывожнасці адначасова. Настаўнік-фасілітатар, як указваюць Э. М. Гусінскі і Ю. І. Турчанінава, «дзейнічае ў духу К. Роджэрса: ён адкрыты, непасрэдны, адносіцца да вучняў з прыманнем і давер'ем, імкнецца паглядзець на свет вачамі дзіцяці і стараецца не складаць ні аб кім канчатковай думкі. Ён кіруецца як асноўнай каштоўнасцю інтарэсамі развіцця асобы вучня і не ставіць сабе жорсткія, канкрэтныя мэты» [3]. Чым вышэйшая здольнасць настаўніка да фасілікацыі, тым больш індывідуальным і дыферэнцыраваным з'яўляецца яго падыход да вучняў, тым больш увагі ён удзяляе іх пачуццям, перажываннямі, часцей уступае ў дыялогі, дыскусіі.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Ожегов С. И. **Словарь русского языка / Под ред. Н. Ю. Шведовой. М., 1998.**

2. Рыданова И. И. **Основы педагогики общения. Мн., 1998.**

3. Гусинский Э. Н., Турчанинова Ю. И. **Образование личности: Пособие для преподавателей. М., 1994.**

# КНІГІ, ЯКІЯ ПАСТУПІЛІ Ў РЭСПУБЛІКАНСКУЮ НАВУКОВА-ПЕДАГАГІЧНУЮ БІБЛІЯТЭКУ

**Беларуская мова.** Зб. практыкаванняў: 5-7 кл.: Дапам. для настаўнікаў, вучняў і бацькоў / Аўт.-склад.: С. Л. Грыцкевіч, А. М. Тамашэвіч. Мн.: Эніпрэс. 2002. 160 с (Для школьнікаў і абітурыентаў).

*Зборнік тэкставых практыкаванняў з'яўляецца дапаможнікам для настаўнікаў пры арганізацыі калектыўнай і індывідуальнай работы па беларускай мове. Ён мае на мэце дапоўніць, паглыбіць, пашырыць практычную частку падручніка, таму ўключае заданні і практыкаванні па ўсіх часцінах, прадстаўленых у школьным курсе.*

**Бомба замедленного действия:** Сб. материалов по экол. воспитанию школьников / Респ. обществ. об-ние обществознания: Авт.-сост.: Т. Криводубская, Н. Поречина; Под ред. А. Воронова. Мн.: Тэхналогія, 2001. 48 с.

*В издании рассматриваются проблемы ТБО (твердых бытовых отходов). Предлагается практический материал для проведения игр по экологической тематике. Будет полезен преподавателям биологии, географии общеобразовательных школ и членам общественных организаций, которые заинтересованы в экологическом воспитании подрастающего поколения.*

**Браиловская Л. Е.** Некоторые принципы работы в классе постановки голоса: Метод. рекомендации / Л. Е. Браиловская. Могилев: МГУ им. А. А. Кулешова, 2001. 30 с.

*Данная работа является попыткой поделиться опытом преподавания вокала. В ней предлагаются некоторые выработанные автором в практической преподавательской деятельности способы овладения вокальной техникой.*

**Верціхоўская М. І.** Беларуская літаратура: Перачытаем разам: Шк. тв. / М. І. Верціхоўская. Мн.: Юніпрэс, 2002. 544 с.

*Кніга ўяўляе сабой прапанову перачытаць разам многія творы нашай нацыянальнай культуры. У ёй раскрываецца працэс узнікнення і развіцця літаратурнай творчасці беларускага народа ад старажытнасці да савецкага перыяду, значную частку кнігі складае пераказ сюжэтаў большасці эпічных твораў, якія вывучаюцца ў школе.*

**(Працяг на стар. 61)**